УДК 323.1(476)+94(476)«1934/1939»

**М. К. Альховік**
Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт

# РЭАРГАНІЗАЦЫЯ І ЛІКВІДАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ШКОЛ БССР У 1934–1939 ГГ.

У артыкуле на аснове шырокага комплексу архіўных дакументаў раскрыты асаблівасці працэсу рэарганізацыі і ліквідацыі нацыянальных агульнаадукацыйных школ БССР. Пасля прыняцця 26 ліпеня 1934 г. пастановы ЦК УКП(б) «Аб рабоце ЦК КП(б)Б і СНК БССР» кіраўніцтвам БССР быў узяты курс на перагляд сеткі не толькі польскіх, але і іншых нацыянальных школ. Разам з тым працэс рэарганізацыі і ліквідацыі школ нацыянальных меншасцяў БССР не набыў усёабдымнага маштабу. Аўтар падкрэслівае, што першапачаткова адказныя і кіраўнічыя работнікі разглядалі магчымасць існавання яўрэйскіх, польскіх і іншых школ у месцах кампактнага пражывання палітычна лаяльнага насельніцтва адпаведнай нацыянальнасці з выразнай этнічнай, культурнай і моўнай самаідэнтыфікацыяй. Пасля выхаду пастановы ЦК УКП(б) «Аб кіраўніцтве ЦК КП(б) Беларусі» ад 27 ліпеня 1937 г. працэс рэарганізацыі і ліквідацыі нацыянальных школ насіў паслядоўны і сістэмны характар. Канчатковае рашэнне аб лёсе яўрэйскіх школ было прынята 3 ліпеня 1938 г., калі выйшла пастанова Бюро ЦК КП(б)Б «Аб рэарганізацыі яўрэйскіх школ у Беларусі ў беларускія школы».

**Ключавыя словы:** нацыянальная палітыка, нацыянальныя меншасці, нацыянальныя школы, БССР.

**Для цытавання:** Альховік М. К. Рэарганізацыя і ліквідацыя нацыянальных школ БССР у 1934–1939 гг. // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 1 (257). С. 71–74.

**M. K. Alkhovik**
Belarusian State Medical University

# REORGANIZATION AND LIQUIDATION OF THE NATIONAL SCHOOLS OF THE BSSR IN 1934–1939

The article reveals the features of the process of reorganization and liquidation of the BSSR's national secondary schools. With the adoption of the resolution of the CC of the VKP(b) "On the work of the CC of the CP(b)B and the SNK of the BSSR" dated July 26, 1934, the BSSR's leadership took a course to revise the network of not only Polish, but also other national schools. The process of reorganization and liquidation of the schools of the BSSR's national minorities has not acquired a comprehensive scale. The responsible and managerial employees considered the possibility of the existence of Jewish, Polish and other schools in the places of compact residence of a politically loyal population of the corresponding nationality with a clear ethnic, cultural and linguistic identity. After the release of the resolution of the CC of the VKP(b) "On the leadership of the CC of the CP(b)B" dated July 27, 1937, the process of the reorganization and liquidation of the national schools was consistent and systematic. On July 3, 1938 the resolution of the Bureau of the CC of the CP(b)B "On the reorganization of the Jewish schools into the Belarusian schools in Belarus" was issued.

**Keywords:** national policy, national minorities, national schools, BSSR.

**For citation:** Alkhovik M. K. Reorganization and liquidation of the national schools of the BSSR in 1934–1939. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2022, no. 1 (257), pp. 71–74 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Адным з напрамкаў нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва БССР у 1920-я – сярэдзіне 1930-х гг. з'яўлялася стварэнне нацыянальных школ і класаў у месцах кампактнага пражывання нацыянальных меншасцяў. Тагачасная сістэма адукацыі адказвала за забеспячэнне праvоў грамадзян на атрыманне адукацыі на роднай мове і выхаванне кадраў будаўнікоў сацыялізму і сусветных рэвалюцыянераў.

У сучаснай гістарыяграфіі ліквідацыя сеткі нацыянальных школ разглядаецца ў кантэксце рэалізацыі новага нацыянальнага курсу, накіраванага на цэнтралізацыю і ўніфікацыю сферы адукацыі, культурна-духоўнага жыцця грамадства [1, с. 92–94]. Разам з тым цэласная карціна развіцця школ нацыянальных меншасцяў у сярэдзіне – канцы 1930-х гг. адсутнічае. У гэтай сувязі мэтай артыкула з'яўляецца вызначэнне этапаў і асаблівасцяў працэсу рэарганізацыі і ліквідацыі нацыянальных школ БССР у 1934–1939 гг.

**Асноўная частка.** У сярэдзіне 1930-х гг. асобныя партыйна-савецкія работнікі пачалі разглядаць установы адукацыі нацыянальных меншасцяў у якасці спрыяльнага асяроддзя для разгортвання антыдзяржаўнай работы.

10 лютага 1934 г. рэдактар газеты «Orka» Г. К. Жарскі ў лісце да сакратароў ЦК КП(б)Б М. Ф. Гікалы і В. Ф. Шаранговіча паведаміў аб «умяшанні дэфензівы і польскага генштаба ў справу вылучэння, выхавання і расстаноўкі кадраў на адпаведных участках нацыянальнай работы» і аб «беларусізацыі польскіх дзяцей і паланізацыі беларускіх дзяцей у некаторых школах» [2, арк. 105, 112].

У пастанове ЦК УКП(б) «Аб рабоце ЦК КП(б)Б і СНК БССР» ад 26 ліпеня 1934 г. асуджалася «няправільная палітыка і практыка насаджэння ў раёнах і сёлах з большасцю беларускага насельніцтва польскіх школ і прымусовага навучання дзяцей на польскай мове». ЦК КП(б)Б абавязваўся «перагледзець сетку і нацыянальны характар школ у духу найбольшага забеспячэння інтарэсаў беларускай мовы». Народны камісарыят асветы (НКА) БССР летам 1934 г. дазволіў выкладаць польскую мову толькі ў польскіх і польска-беларускіх школах, а таксама дзецям-палякам у беларускіх школах (класах) [3, арк. 120].

У 1934–1937 гг. уладамі былі інспіраваныя масавыя сходы настаўнікаў, вучняў і бацькоў. Ва ўмовах адміністрацыйнага ціску яны давалі згоду на пераўтварэнне нацыянальных школ у беларускія.

Згодна з сакрэтнай дакладной запіскай загадчыка Дзяржынскага райана Н. Лазоўскага ад 3 лютага 1936 г., пры рэарганізацыі школ улічвалася паспяховасць вучняў, ступень валодання імі польскай мовай, размоўная мова навакольных жыхароў, палітычная свядомасць вучняў і настаўнікаў, а ўжо потым жаданні настаўнікаў, бацькоў і вучняў, нацыянальны склад школы [4, арк. 261–311].

Невялікія школы былі далучаны да суседніх беларускіх. НКА БССР забяспечваў рэарганізаваныя школы і класы настаўнікамі, падручнікамі, дапаўняў склад вучняў дзецьмі іншых нацыянальнасцяў [5, арк. 77].

Палякі, якія атаясамлялі сябе з навакольным насельніцтвам, слаба валодалі польскай мовай і арыентаваліся на рускую савецкую культуру, адобрылі рэарганізацыю школ [3, арк. 92]. Асобы з высокім узроўнем нацыянальнай свядомасці, якія выкарыстоўвалі ў жыцці польскую і беларускую мовы, выступілі за захаванне адукацыі на польскай мове альбо за вывучэнне польскай мовы ў якасці вучэбнага прадмета. Шэраг польскіх работнікаў выступіў супраць механічнага аднясення ўсіх каталікоў да ліку беларусаў, рэарганізацыі Дзяржынскага раёна, польскіх сельсаветаў і школ.

14 лістапада 1934 г. у выніку пратэстаў польскага насельніцтва Бюро ЦК КП(б)Б абавязала Аддзел культуры і прапаганды ЦК КП(б)Б і НКА БССР «неадкладна рэагаваць на ўсялякія сігналы і заявы, якія паступаюць з месцаў, у сувязі з <…> рэарганізацыяй, праводзячы дакладную праверку гэтых фактаў з выездам адказных работнікаў на месца» [6, арк. 24б]. Для тлумачэння прычын рэарганізацыі школ накіроўваліся прадстаўнікі ЦК КП(б)Б [7, арк. 205].

Рэалізацыя дырэктыўных указанняў кіраўніцтва Савецкай Беларусі прывяла да паступовага змяншэння ліку ўсіх нацыянальных школ. Так, калі ў пачатку 1934 г. існавалі 327 яўрэйскіх, 337 польскіх, 24 латышскія, 13 літоўскіх школ, то ў верасні 1936 г. – 196, 107, 12 і 9 адпаведна [5, арк. 77].

У цэлым улады не адмаўлялі магчымасці існавання школ для нацыянальных меншасцяў з выразнай этнічнай і культурна-моўнай самаідэнтыфікацыяй у месцах іх кампактнага пражывання. Так, у 1934 г. у Гомелі працавалі 2 асірыйскія дзённыя класы для дзяцей і 2 вячэрнія асірыйскія класы, у 1937/1938 навучальным годзе – 1-шы асірыйскі клас пры чыгуначнай школе. У 1934/1935 навучальным годзе былі адкрыты цыганская няпоўная сярэдняя школа (НСШ) у Віцебску, нямецкая НСШ для вучняў-немцаў з усёй БССР у Ельскім раёне і г. д. У 1936 г. у БССР функцыянавалі 4 цыганскія школы (у мястэчку Стрэшын Жлобінскага раёна, у Рагачоўскім раёне і дзве у Віцебскім раёне) і 3 цыганскія групы. Пры цыганскіх калгасах і арцелях працавалі пачатковыя беларускія і рускія школы з выкладаннем цыганскай мовы [8, с. 108]. На працягу 1936–1939 гг. ва Упраўленні пачатковай школы НКА БССР існаваў Аддзел небеларускіх школ. Права грамадзян на атрыманне адукацыі на роднай мове было зафіксавана ў артыкуле 96 Канстытуцыі БССР, прынятай 19 лютага 1937 г.

З другой паловы 1937 г. савецкая ўлада ажыццяўляла захады па канчатковай ліквідацыі ўстаноў адукацыі нацыянальных меншасцяў. У адпаведнасці з пастановай ЦК УКП(б) «Аб кіраўніцтве ЦК КП(б) Беларусі» ад 27 ліпеня 1937 г. і пастановай Бюро ЦК КП(б)Б «Аб ліквідацыі палітыкі паланізацыі» ад 28 ліпеня 1937 г. закрыццё польскіх школ з'яўлялася неабходным крокам для пераадолення наступстваў «паланізацыі беларусаў», якую быццам бы праводзіла былое кіраўніцтва БССР. У жніўні – верасні 1937 г. былі рэарганізаваны ўсе польскія школы.

Падчас пленума ЦК КП(б)Б ад 17–19 жніўня 1937 г. в. а. першага сакратара ЦК КП(б)Б А. А. Волкаў адзначыў, што польскае насельніцтва прызнала рэарганізацыю польскіх школ: «Мы былі ў калгасе "Трэці Інтэрнацыянал„ <…> прамым галасаваннем паставілі пытанне: ці згодныя з рашэннем урада. Вядома, – кажуць, – згодныя. Нам больш нічога і не трэба... Нічога, няхай жывуць, працуюць, а шкодзіць будуць – возьмем на дачу» [9, арк. 173].

У пастанове Бюро ЦК КП(б)Б «Аб гаспадарча-палітычным становішчы Лёзненскага раёна» ад 31 снежня 1937 г. адзначалася, што «створаныя нацыянал-фашыстамі эстонская, літоўская і латышская школы [і класы] <…> з'яўляюцца гнёздамі контррэвалюцыйнай работы». Да канца 1937/1938 навучальнага года працягвала функцыянаваць літоўская школа ў Малькаўскім літоўскім сельсавеце, вялося выкладанне на польскай мове ў малодшых класах НСШ пры калгасе імя Чапаева ў Лепельскім раёне. Цыганскія класы праіснавалі ў БССР да канца 1938 г. [10, арк. 236 зв.]

3 ліпеня 1938 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б П. К. Панамарэнка падпісаў пастанову Бюро ЦК КП(б)Б «Аб рэарганізацыі яўрэйскіх школ у Беларусі ў беларускія школы» [11, арк. 287]. СНК БССР рэарганізаваў 78 яўрэйскіх школ у беларускія, 27 – у рускія, 60 – далучыў да беларускіх. У Мінску яўрэйскія школы былі пераведзены на беларускую мову, у Гомельскай вобласці – на рускую, 32 яўрэйскія школы Віцебскай вобласці былі рэарганізаваныя ў 3 рускія і 29 беларускіх. З-за супраціўлення насельніцтва асобныя яўрэйскія школы, а таксама школы з выкладаннем ідыш ў якасці вучэбнага прадмета праіснавалі да сярэдзіны – канца 1939 г. [12, арк. 30].

Ліквідацыя яўрэйскіх школ тлумачылася адасобленасцю дзяцей, антысавецкімі сувязямі (настроем, мінулым, паходжаннем) настаўнікаў, добраахвотнай асіміляцыяй і незацікаўленасцю яўрэяў у атрыманні адукацыі на ідыш.

Першапачаткова НКА БССР не даў указанняў райана і гарана аб перакваліфікацыі настаўнікаў, камплектаванні класаў і праходжанні прадметаў. У сувязі з гэтым узніклі праблемы з забеспячэннем школ новымі падручнікамі і дапаможнікамі. 16 верасня 1938 г. НКА БССР адкрыў трохмесячныя курсы перакваліфікацыі педагагічнага персаналу былых яўрэйскіх школ пры Інстытуце павышэння кваліфікацыі кадраў народнай адукацыі. 27 верасня 1938 г. яўрэйская газета «Акцябер», папулярызуючы культурна-моўную асіміляцыю яўрэяў, ухваліла закрыццё яўрэйскіх школ.

Асіміляваныя яўрэі лічылі немэтазгодным існаванне школ з выкладаннем на ідыш. Асобныя бацькі адправілі дзяцей у рускія і беларускія школы з-за зніжэння папулярнасці яўрэйскай адукацыі. Ліквідацыя яўрэйскіх школ выклікала мабілізацыю нацыянальных пачуццяў тых яўрэяў, якія захоўвалі прыхільнасць да традыцыйнай культуры на аснове іўрыта і іўдаізму альбо да яўрэйскай савецкай культуры на мове ідыш. Зафіксаваны шматлікія выпадкі выступленняў пісьменнікаў, навукоўцаў, педагагічных і культурных работнікаў, навучэнцаў і іх бацькоў супраць рэарганізацыі і ліквідацыі яўрэйскіх школ. ЦК КП(б)Б і НКУС БССР асудзілі і пачалі крымінальнае праследаванне ўдзельнікаў стыхійнага руху пратэсту як контррэвалюцыянераў, якія спрабуюць спыніць «натуральны працэс асіміляцыі яўрэяў», адасобіць апошніх ад рускай і беларускай моў [1, с. 93].

**Заключэнне**. Такім чынам, з 1934 г. кіраўніцтвам БССР быў узяты курс на перагляд сеткі не толькі польскіх, але і іншых нацыянальных школ. Разам з тым да ліпеня 1937 г. працэс рэарганізацыі і ліквідацыі школ нацыянальных меншасцяў не набыў усёабдымнага маштабу. Адказныя і кіраўнічыя работнікі не адмаўлялі магчымасці існавання яўрэйскіх, польскіх і іншых школ у месцах кампактнага пражывання палітычна лаяльнага насельніцтва адпаведнай нацыянальнасці з выразнай этнічнай, культурнай і моўнай самаідэнтыфікацыяй. З прыняццем пастановы ЦК УКП(б) «Аб кіраўніцтве ЦК КП(б) Беларусі» ад 27 ліпеня 1937 г. ліквідацыя нацыянальных школ набыла паслядоўны і сістэмны характар.

Канчатковае рашэнне аб лёсе школ нацыянальных меншасцяў БССР было прынята 3 ліпеня 1938 г., калі выйшла пастанова Бюро ЦК КП(б)Б «Аб рэарганізацыі яўрэйскіх школ у Беларусі ў беларускія школы».

**Спіс літаратуры**

1. Скир А. Я. Еврейская духовная культура в Беларуси: историко-литературный очерк. Минск: Мастац. літ., 1995. 144 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 6912.
3. НАРБ. Фонд 4-п. Воп.1. Спр. 7125.
4. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 10870.
5. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 7816.
6. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 7206.
7. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 9152.
8. Матэрыялы к адчоту Віцебскага гарадскога Совета рабочых і чырвонаармейскіх дэпутатаў склада 1930–1934 гг. Віцебск: Друкарня Комінтэрн, 1934. 142 с.
9. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 10963.
10. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 11049.
11. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 12428.
12. НАРБ. Фонд 4-п. Воп. 1. Спр. 12986.

## References

1. Skir A. Ya. *Yevreyskaya dukhovnaya kul'tura v Belarusi: istoriko-literaturnyy ocherk* [The Jewish spiritual culture in Belarus: a historical and literary essay]. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 1995. 144 p.
2. National Archive of the Republic of Belarus (NARB). Fund 4p. I. 1. F. 6912.
3. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 7125.
4. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 10870.
5. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 7816.
6. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 7206.
7. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 9152.
8. *Materyyaly k adchotu Vitsebskaga garadskoga Soveta rabochykh i chyrvonaarmeyskikh deputatau sklada 1930–1934 gg.* [Materials for the report of the Vitsebsk City Council of Workers' and Red Army Deputies of 1930–1934]. Vitsebsk, Drukarnya Komintern Publ., 1934. 142 p.
9. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 10963.
10. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 11049.
11. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 12428.
12. NARB. Fund 4p. I. 1. F. 12986.

## Інфармацыя пра аўтара

**Альховік Мікалай Канстанцінавіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры філасофіі і паліталогіі. Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт (220116, г. Мінск, пр-т Дзяржынскага, 83, Рэспубліка Беларусь). E-mail: alch0109@gmail.com

## Information about the author

**Alkhovik Mikalay Kanstantsinavich** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of History of Philosophy and Political Science. Belarusian State Medical University (83, Dziarzhynskaga Ave., 220116, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: alch0109@gmail.com

*Паступіла 10.03.2022*